# ДА ПЫТАННЯ АБ СТВАРЭННІ БЕРАСЦЕЙСКАЙ УНІІ

*УО «Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі»*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Гуцалюк Г.С.*

*Літвіноўская Ю.І. – к.і.н., дацэнт*

XV–XVI ст. у еўрапейскай гісторыі – перыяд бурных унутрыпалітычных падзей якія атрымалі назву Рэфармацыя. Свае водгукі яна мела і на беларускіх землях. Адным з праяўленняў барацьбы з гэтым працэсам у ВКЛ была Берасцейская унія.

У 1054 г. адбыўся канчатковы раскол хрысціянскай царквы на заходнюю – каталіцтва і ўсходнюю – праваслаўе. Асноўнымі фактарамі ажыццяўлення уніі былі: рэфармацыя і контррэфармацыя канца 16 ст. у Рэчы Паспалітай, і барацьба праваслаўных цэркваў ВКЛ і Масквы за пераняцце кіравальнай ролі канстанцінопальскага патрыярхату (2-я пал. 15—16 ст.), на агульным фоне каталіцкай экспансіі на землі ВКЛ (з кан. 14 ст.).

Пачынаючы з кан. XIV ст. ў Вялікім княстве Літоўскім былі шырока прадстаўлены абедзве хрысціянскія канфесіі - праваслаўе і каталіцтва. Да XVI ст. у ВКЛ назіраўся пэўны крызіс праваслаўя, якое не здолела стварыць ўласную добраналаджаную сістэму адукацыі, што было заўважана сучаснікамі і былі спробы палепшыць становішча, але адбіўся і ціск які адчувалі праваслаўныя з боку ўлады. Праваслаўе страчвала інтэлектуальную апору – тагачасную інтэлігенцыю.

Езуіт Пётр Скарга адмячаў стан праваслаўя ў ВКЛ так – “папы схалопелі, навука ўпала”. Да таго, ва ўмовах Лівонскай вайны з Маскоўскай дзяржавай арыентацыя на Маскву (цэнтр праваслаўя, з 1589 патрыярхія) было здрадніцтвам. У той час на Захадзе наглядаўся духоўны ўздым, ствараліся нацыянальныя цэрквы. Неабходнасць рэфармавання царквы разумелі беларускія праваслаўныя іерархі. Супадзенне гэтых фактараў паспрыяла хуткаму правядзенню царкоўнай рэформы – увядзенню ўніяцтва.

У першай палове 1590-х гг. на шматлікіх сустрэчах з прадстаўнікамі Ватыкана праваслаўныя іерархі выпрацоўвалі ўмовы аб’яднання цэркваў у ВКЛ. Ініцыятарамі ўніі выступілі епіскап берасцейскі і ўладзіміскі Іпаці Пацей і епіскап луцкі Кірыла Тарлецкі. Іх падтрымалі кіеўскі мітрапаліт Міхаіл Рагоза, кароль і князь Жыгімонт Ваза і канцлер ВКЛ Леў Сапега. На царкоўным саборы вясной 1595 г. з намерам заключыць унію згадзіліся ўсе праваслаўныя епіскапы, акрамя львоўскага. Былі выпрацаваны “33 артыкулы” – умовы аб’яднання.

Пасля прыняцця ўніі не павінна было быць ломкі звычаяў і традыцый – знешне нічога не змянілася. 23 снежня 1595 г. І.Пацей і К.Тарлецкі сустрэліся ў Рыме з Кліментам VIII, які згадзіўся з усімі ўмовамі і падпісаў папскую буллу аб уніі. 6-9 кастрычніка 1596 г. ў Бярэсце на царкоўным саборы, куды з’ехаліся прыхільнікі ўніі, уніяцтва было канчаткова афармлена як рэлігійны накірунак. Адначасова ў Бярэсці на свой сабор сабраліся прыхільнікі захавання чысціні праваслаўя, лідэрам іх быў епіскап львоўскі. . 15 кастрычніка 1596 г. каралеўскім універсалам акт уніі быў зацверджаны на дзяржаўным узроўне. Афіцыйна праваслаўная царква ў ВКЛ перастала існаваць, была створана грэка-уніяцкая царква.

Берасцейская унія — акт пра арганізацыйнае аб'яднанне каталіцкай і праваслаўнай цэркваў на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Абвешчана ў кастрычніку 1596 на царкоўным саборы ў Брэсце, зацверджана каралём Рэчы Паспалітай Жыгімонтам III Вазам.

Грамадства ўспрыняла ўвядзенне ўніі па-рознаму. Частка насельніцтва рашуча яе падтрымала асабліва ў епархіях, што ўзначальвалі прыхільнікі ўніі, частка насельніцтва рашуча адмовіліся ад рэформы. Традыцыя праваслаўя не дапускала аніякіх змен – так не магла захавацца чысціня “першапачатковасці” хрысціянства. Увядзенне ўніі прымалася як асабістая трагедыя. Іншыя праваслаўныя дзеячы выступалі не супраць уніі, а супраць падпарадкавання папе, супраць рэгіянальнага характару ўніі. Такое моцнае супраціўленне было непрадбачаным, канфрантацыя нарастала. Адбываліся сутычкі, барацьба за храмы і епіскапскія катэдры, некаторыя падзеі прымалі жудасныя формы.

Уніяцтва праз падтрымку дзяржавы і культурна-асветніцкую дзейнасць паступова пашыралася сярод сельскага насельніцтва і гараджан, дробнай шляхты. Да пачатку XVIII ст. яно стала самай масавай рэлігіяй у княстве, значна дапамагло захаваць нацыянальныя адметнасці беларускага народа, стрымала апалячванне беларускіх земляў. Гэта азначае, што тыя надзеі, якія ўсклалі на ўніяцтва ў Ватыкане і Кракаве, збольшага не збыліся. Больш удала Ватыкан і Кракаў дзейнічалі ў асяроддзі сярэдніх і буйных феадалаў ВКЛ. Пад час контррэфармацыі яны амаль ўсе перайшлі ў каталіцтва, што паспрыяла іх апалячванню, зліццю з феадальным саслоўем Польшчы ў адзінае феадальнае саслоўе Рэчы Паспалітай. Большасць Беларускіх феадалаў страчвалі сувязь з гістарычнай традыцыяй дзяржавы ВКЛ, са сваім народам.

Прыхільнікі праваслаўя не зніклі з гістарычнай сцэны. У 1620 г. яны тайна, пры падтрымцы Маскоўскага патрыярха, пасвяцілі новую іерархію ў Кіева-Пячорскай Лаўры, якая кантралявалася праваслаўнымі. Так канчаткова адбыўся раскол былых праваслаўных княства на дзве царквы. У ўсходніх раёнах княства праваслаўныя карысталіся значнай падтрымкай, асабліва ў буйных гарадах. Таму кіраўнікі дзяржавы з цягам часу вымушаны былі афіцыйна прызнаць адраджэнне праваслаўя ў княстве. У 1632 і 1633 гг. Уладзіслаў IV Ваза прызнаў існаванне праваслаўных цэркваў і надаў ім некаторыя прывілеі, у 1650 г. гэтыя прывілеі падцвердзіў Ян Казімір.

Прыследванне праваслауных на Украіне працягвалася, і у прыканцы паітычны і рэлігійна націск выліуся у паустанне Хмельніцкага, у выніку якога Польшча лішылася паловы Украіны. Однак на тэрыторыях, застаушыся пад Польскай уладай — правабярэжнай Украіне и Беларуссі, — націск на праваслауных працягвауся и стагодзе пасля, калі ужо паслабленая РП была падзелена, Расіі засталіся тэрыторыі поунасцю уніяцкія.

Спіс літаратуры:
1. Беларусазнаўства: навук. дапам. Пад рэд. Брыгадзіна П.1. – Мн., 1997.
2. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Под рэд. Новіка Я.К., Марцуля Г.С. – Мн., 1998.